**Чайка Н. У. (Мінск)**

# РЭГУЛЯВАННЕ СІНТАКСІЧНАЙ ВАРЫЯТЫЎНАСЦІ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

У сінтаксічнай сістэме беларускай мовы шырока прадстаўлены структурна-семантычныя варыянты канструкцый. Функцыянаванне сінтаксічных мадыфікацый абумоўлена рэгулятыўнай дзейнасцю значнай колькасці моўных механізмаў (В.У. Гусева, Т.Г. Міралюбава, Г.П. Мельнікаў, Я.У. Клабукаў, А.Я. Кібрык). Сінтаксічная і семантычная кампенсацыя ў варыятыўных канструкцыях ажыццяўляецца з дапамогай моўных сродкаў розных узроўняў – сінтаксічнага, марфалагічнага, лексічнага, можа быць абумоўлена логіка-семантычнымі і семантыка-сінтаксічнымі фактарамі.

**Структурна-сэнсавыя** моўныя механізмы рэгулююць кампенсаторную функцыю частак у структуры поліпрэдыкатыўных сінтаксічных адзінак з эліпсісам дзеяслова – эксгліцытна-паратаксічнага, імпліцытна-паратаксічнага, эксгліцытна-гіпатаксічнага, імпліцытна-гіпатаксічнага, камбінаванага відаў; самастойных сінтаксічных адзінак у структуры звышфразавага адзінства з наступнымі семантыка-сінтаксічнымі адносінамі – далучальнай неадпаведнасці, далучальнага супастаўлення, далучальна-заключальных, далучальна-прычынных, далучальна-мэтавых, далучальна-выяснальных; парцэляванай і эліптычнай адзінак у структуры звышфразавага адзінства з сінтаксічнай сувяззю далучальна-паратаксічнай, далучальна-гіпатаксічнай, далучальна-паўпрэдыкатыўнай. Структурна-сэнсавыя моўныя механізмы рэгулююць кампенсаторную функцыю

кампанентаў у структуры ўскладненай сінтаксічнай адзінкі. Рэгулятыўная функцыя ажыццяўляецца на аснове паратаксічнай і паўпрэдыкатыўнай сінтаксічнай сувязі.

**Сэнсавыя** моўныя механізмы рэгулююць кампенсаторную функцыю пры замяшчэнні эліпсаванага выказніка функцыянальна тоесным у эліптычных канструкцыях дынамічна-лакатыўнага, экзістэнцыяльна-лакатыўнага, лакатыўна-пацыентыўнага, акцыянальна-безаб'ектнага, акцыянальна-дэліберартыўнага, акцыянальна-аб'ектнага пераўтваральнага, акцыянальна-аб'ектнага непераўтваральнага, экзістэнцыяльна-тэмпаральнага, статальнага, рэляцыйнага тыпаў. Сэнсвыя моўныя механізмы таксама вызначаюць дыяпазон функцый словаформ у парадыгме эліптычных сінтаксічных мадыфікацый з імпліцытнай семантыкай. Пры гэтым поліфункцыянальнасць закранае сінтаксічныя пазіцыі выказнік – акалічнасць мэты – акалічнасць месца – акалічнасць часу – азначэнне і семантычныя – прэдыкат – фінітыў-4 – лакатыў (імпл.) – тэмпаратыў (імпл.). Часцей сінтаксічныя сувязі і адносіны ў названых парадыгмах набываюць пераменны характар і залежаць ад тыпу прэдыката. Сэнсавыя моўныя механізмы рэгулююць кампенсаторную функцыю некаторых кампанентаў у структуры звышфразавага адзінства. Падобныя выпадкіназіраюцца часцей паміж каманентамі звышфразавага адзінства з логіка-семантычнымі адносінамі тоеснасці, уключэння і перакрыжавання. Паміж прэдыкатыўнымі адзінкамі з інтрадуктыўнай сінтаксічнай сувяззю кампенсаторная функцыя ажыццяўляецца выключна на ўзроўні семантычнай арганізацыі сказа і рэалізуецца ў канструкцыях з устаўнымі канструкцыямі і зваротакамі.

**Фармальныя** моўныя механізмы ў беларускай мове выкарыстоўваюцца пры пабудове мадэлей і схем сінтаксічных адзінак. Фармалізацыя тыпаў канструкцый з эліпсісам дзеяслова заснавана на іх сэнсавай класіфікацыі і ўключае набор семантычных кампанентаў у адпаведнасці з характарам прэдыката (акцыянальны, рэляцыйны, статальны) і прыналежнасцю да пэўнага віду (напрыклад, кампаненты суб'ектнага, аб'ектнага тыпу, сітуанты, сірканстанты і інш.), што дазваляе стварыць градацыйную класіфікацыю мадэлей эліптычных канструкцый на аснове ступені іх частотнасці і прадуктыўнасці.

**Актуалізацыйныя** моўныя механізмы забяспечваюць эксплікацыю прэдыкатыўных значэнняў спецыфічнымі сродкамі розных узроўняў.

Кампенсаторную функцыю выконваюць кампаненты сінтаксічнага ўзроўню – сінтаксічны паралелізм, сінтаксічныя адносіны, дэтэрмінаваныя члены сказа, звароткі, парцэляваныя і ўстаўныя канструкцыі, значэнне эксплiцытна выражанага выказніка ў структуры поліпрэдыкатыўнай сінтаксічнай адзінкі і складанага сінтаксічнага цэлага, граматычнае значэнне адасобленай акалічнасці і азначэння, злучнік каб. На ўзроўні марфалагічнай арганізацыі кампенсаторную функцыю выконваюць мадальныя, узмацняльныя, вылучальна-абмежавальныя, формаўтваральныя часціцы, формы дапаўнення. Рэгулятыўную функцыю выконваюць і адзінкі лексічнага

ўзроўню – назоўнікі і займеннікі, што ўказваюць на асобу, назоўнікі і прыслоўі з часавым значэннем, безасабова-прэдыкатыўныя прыслоўі. Актуалізацыйныя моўныя механізмы рэгулююць фарміраванне семантыкі ў эліптычных канструкцыях імпліцытным спосабам, што ўключае пераемнасць кампанентаў аб'ектна-суб'ектнага тыпу ў структуры складанага сказа або складанага сінтаксічнага цэлага, сэнсавую спалучальнасць кампанентаў. Паміж канструкцыямі і іх часткамі з логіка-семантычнымі адносінамі кампенсаторная функцыя дазваляе ўтвараць варыятыўны рад з сінанімічнымі сінтаксічнымі пераўтварэннямі, з рэферэнтнай аднесенасцю кампанентаў суб'ектнага тыпу; з уключэннем простай мовы ў семантычную структуру сказа, з рэферэнтнай аднесенасцю кампанентаў аб'ектнага тыпу.

**Інтэрпрэтацыйныя** моўныя механізмы рэгулююць фактары ідэнтыфікацыі семантычнай і сінтаксічнай функцый словаформы ў парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый з сінанімічнымі сінтаксічнымі пераўтварэннямі і катэгарыяльнымі зменамі. Падобная з'ява часцейназіраецца пры канстантным характары сінтаксічных сувязей і адносін, пры пераменным характары граматычных форм (вытворныя сінтаксічныя канструкцыі), пры канстантным характары сінтаксічных сувязей і адносін (канструкцыі з катэгарыяльнымі зменамі сінтаксем), пры пераменным характары сінтаксічных сувязей і адносін (канструкцыі са зменай іерархічнага статусу сінтаксем).

**Літаратура**

1. Кибрик, А. Е. Константы и переменные языка / А. Е. Кибрик ; Моск.гос. ун-т, Филол. фак. – СПб.: Алетейя, 2005. – 719 с.
2. Клобуков, Е. В. Иерархизация однородных смыслов в предложении (высказывании) как проблема функциональной грамматики / Е. В. Клобуков // Системные семантические связи языковых единиц: сб. ст. / Моск. гос. ун-т ; редкол.: К. В. Горшкова (отв. ред.) [и др.]. – М., 1992. – С. 28–38.
3. Лингвистический энциклопедический словарь / Акад. наук СССР, Ин-т языкознания ; гл. ред. В. Н. Ярцева. – М. : Совет. энцикл., 1990. – 682 с.
4. Мельников, Г. П. Системная типология языков: принципы, методы, модели / Г. П. Мельников ; Рос. акад. наук, Ин-т языкознания. – М. : Наука, 2003. – 393 с.
5. Миролюбова, Т. Г. Методы восстановления и интерпретации намеренных смысловых пропусков в диалогическом микротексте / Т. Г. Миролюбова // Методы и результаты семантических исследований : межвуз. сб. науч. тр. / Башкирск. гос. пед. ин-т ; редкол.: Т. Д. Шабанов (отв. ред.) [и др.]. – Уфа, 1989. – С. 83–91.
6. Гусева, Е.В. Языковые механизмы вариативной интерпретации действительности во французских и русских рекламных текстахтема диссертации и автореферата по ВАК 10.02.20, кандидат филологических наук Гусева, Елена Владимировна.